**Ю. А. Шлемен**

## ВОБРАЗ ПРАГІ Ў ТВОРАХ ЧЭШСКАЙ І НЯМЕЦКАМОЎНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*yulenka.shlemen@gmail.com;*
*навук. кір. – А. У. Вострыкава, канд. філал. навук, дац.*

Разглядаецца вобраз Прагі ў чэшскіх і нямецкамоўных празаічных і паэтычных творах markрознага часу. Выяўляюцца мастацкія адметнасці ў паказе чэшскай сталіцы аўтарамі (Г. Майрынк, Ф. Кафка, Я. Неруда, С. Чэх, В. Незвал, М. Кундэра, Я. Сейферт).

***Ключавыя словы:*** вобраз Прагі; гарадскі тэкст; нямецкамоўная проза; чэшская проза; чэшская паэзія; тэма горада.

Вобраз горада як такога заўсёды прыцягваў увагу філосафаў і пісьменнікаў. Ужо ў эпоху Рэнесансу людзі выказвалі свае меркаванні пра «ідэальны горад», аднак з цягам часу сам вобраз стаў звязвацца са змрочнымі ўяўленнямі. Сёння ў літаратуры існуе два падыходы да паказу горада – гуманістычны і адчужаны. Першы сустракаецца ў пісьменнікаў, успрынящце якіх прасякнута духам аптымізму, упэўненасцю ў будучыні. Другі з'явіўся ў к. XIX – пач. XX стст., калі асобны індывід пачаў пагружацца ў самаізаляцыю, адзіноту і смутак [1, с. 219].

Зварот пісьменнікаў да тэмы горада садзейнічаў узнікненню так званых «гарадскіх тэкстаў», дзе цэнтральнае месца займае вобраз горада. Знакаміты чэшскі празаік Б. Грабал у сваім рамане-інтэрв'ю «Вузельчыкі на памяць» згадвае вобразы гарадоў, якія найчасцей сустракаюцца ў літаратуры: «…быў менавіта Эман Фрынта, які вызначыў, што там, дзе ёсць скрыжаванні некалькіх моўных свядомасцей, менавіта там заўсёды ўзнікае вялікая літаратура. Як доказ гэтаму ён прыводзіў Прагу, яўрэйска-славянска-нямецкае скрыжаванне, як прыклад прыводзіў Адэсу, прыводзіў Трыест, Цюрых, скрыжаванні, дзе ўзнік дадаізм, сёння ўводзіць Парыж, куды палова мастакоў прыйшла з Іспаніі, Расіі, Украіны, Венгрыі, Амерыкі і г. д. Эман Фрынта прыводзіў Санкт-Пецярбург, дзе таксама былі скрыжаванні свядомасці» [2, с. 19].

Даследаванне чэшскай і нямецкамоўнай літаратурнай спадчыны паказала, што вобраз Прагі на працягу ўсяго развіцця прозы і паэзіі заставаўся важным і ключавым. Аднак кожны аўтар успрымаў Прагу па-свойму, што адлюстравана ў іх творах. Замежныя аўтары ўспрымалі Прагу пераважна як містычны горад і стваралі адпаведны вобраз у сваіх творах.

Прыкладам з’яўляецца раман аўстрыйскага пісьменніка Г. Майрынка «Голем» (1914), дзе ўсе апісанні горада пададзены суб’ектыўна. Разам з тым знаходзяцца і дакладныя назвы вуліц і будынкаў. У Празе аўтара можна сустрэць двайнікоў і міражы, а таксама нетыповыя і падазроныя дамы. Для аўстрыйскага пісьменніка Прага як горад уяўляе цікавасць сваімі пабудовамі, апісанне якіх падаецца метафарычна. Аднак аўтар у сваёй творчасці не апявае і не ўсхваляе чэшскую сталіцу.

Нямецкамоўны пісьменнік яўрэйскага паходжання Ф. Кафка, які жыў у чэшскай сталіцы, ставіўся да Прагі па-іншаму. У яго творах няма пражскай рамантыкі з яе легендамі і паданнямі, паколькі сама сталіца і жыццё ў ёй не прынеслі аўтару станоўчых эмоцый, а былі звязаныя толькі з болем, пакутамі і паражэннямі. Напрыклад, у рамане «Працэс» аўтар наўмысна апісвае вулічныя будынкі ў змрочных танах. Многія даследчыкі літаратуры пазналі ў гэтым апісанні пражскі рабочы раён Жыжкаў. Пісьменнік выкарыстоўваў толькі пэўныя тапаграфічныя арыенціры, неабходныя для апісання мясцовасці, але не звяртаўся да іх з мэтай узвялічвання вобраза Прагі.

У вядомага чэшскага рэаліста Я. Неруды вобраз Прагі паказаны праз дзейнасць жыхароў чэшскай сталіцы. Празаічны цыкл «Маластаранскія аповесці» (Malostranské povídky, 1878) стаў новым этапам у развіцці ўсёй чэшскай прозы. Абагульнены вобраз Малай Страны ўзнікае ў чытача не толькі з прамой аўтарскай характарыстыкі, але і з яркіх вобразаў тыповых прадстаўнікоў дадзенага раёна Прагі, з іх аповедаў і жыцця. Паколькі аўтар звярнуўся толькі да аднаго раёну чэшскай сталіцы, то сам вобраз Прагі і яе гістарычны раён успрымаюцца чытачом як ціхі, стары і дрымотны.

С. Чэх у рамане «Новае эпахальнае падарожжа пана Броўчэка, на гэты раз ў XV ст.» (Nový epochální výlet pana Broučka tentokrát do XV. století, 1888) таксама звяртаецца да вобраза Прагі, але апісвае яе выгляд адпаведна XV ст. Для аўтара горад звязаны з разбурэннямі, паколькі на гэты перыяд прыпалі гусіцкія войны. Нягледзячы на гэта, пісьменнік з замілаванасцю апісвае пражскія вулачкі і будынкі. Сам С. Чэх захапляецца вобразам Прагі. Аўтар уводзіць у твор назвы пражскіх гарадскіх аб’ектаў, якія дазваляюць чытачу лёгка арыентавацца ў мясцовасці і параўноўваць Прагу XV і XXI стст. Разам з тым аўтар дадае ў вобраз горада адценне містычнасці і патаемнасці праз увядзенне ў твор гісторыі пра падземныя хады.

Чэшскі авангардыст В. Незвал у сваёй творчасці апісвае Прагу тонка і лірычна, апявае і ўсхваляе, як каханую жанчыну. Для аўтара Прага стала не толькі горадам, прыгажосць якога можна параўнаць з дзяўчынай, але і месцам, створаным для паэзіі. У зборніку «Прага з пальцамі дажджу» (Praha z prsty deště, 1936) паэт паказвае рознабаковасць чэшскай сталіцы, якая злучае ў сабе адначасова і святых, і простых, звычайных людзей. Асабліва зачараваны аўтар начной Прагай, якую апісвае ў паэме «Эдысан» (Edison,

1928). Разам з тым аўтар згадвае, што ў горадзе ёсць і жабракі, і жанчыны лёгкіх паводзін. Гэта дазваляе чытачу ўбачыць Прагу з розных бакоў.

Сучасны чэшскі раманіст М. Кундэра ўспрымае Прагу неадназначна. Ён часта звяртаецца да дадзенага вобраза, але не пералічвае канкрэтныя назвы гарадскіх аб'ектаў. Напрыклад, у рамане «Невыносная лёгкасць быцця» (Nesnesitelná lehkost bytí, 1982) апісваюцца падзеі Пражскай вясны, якія непасрэдна ўплятаюцца ў лёс галоўных герояў. Гістарычныя ўмовы, у якіх апынуліся персанажы, прымушаюць іх пакінуць любімую Прагу, ставіцца да яе неадназначна. Супакой і цішыню галоўныя героі кундэраўскага рамана знаходзяць у начной Празе, што дазваляе ім перажыць цяжкую палітычную сітуацыю ў краіне.

Вобраз Прагі стаў галоўным і вызначальным для творчасці чэшскага паэта Я. Сейферта. Даследчыца К. У. Айзпурвіт адзначыла, што «яго адзіным горадам засталася Прага, да якой ён ставіўся як да каханай жанчыны. Любоў да Прагі і любоў да жанчыны – гэтыя дзве тэмы сталі галоўнымі ў паэзіі Яраслава Сейферта» [4, с. 5]. Амаль усе назвы пражскіх гарадскіх аб'ектаў звязаныя ў аўтара з ўспамінамі пра маладосць і першае каханне. Абодва вобразы – Прагі і жанчыны – прасякнутыя пачуццём цеплыні і пяшчоты. Прага для Я. Сейферта на працягу ўсяго яго жыццёвага і творчага шляху была звязаная выключна з прыемнай жаночай энергетыкай, а сам горад ніколі не выклікаў адмоўных пачуццяў. Неабходна падкрэсліць, што ў яго вершах няма адчування таямнічасці і непрадказальнасці Прагі, характэрнай для творчасці некаторых пісьменнікаў не чэхаў. Вобраз Прагі часта ўспрымаўся імі праз прызму пэўнай загадкавасці, дзякуючы вялікай колькасці легендаў і паданняў, звязаных з горадам, незвычайных завулкаў і маленькіх вулачак, што захоўваюць у сабе гсіторыю і таямніцы мінуўшчыны. А для нобелеўскага лаўрэата Я. Сейферта кожны пражскі завулак і раён вядомы з маленства, пра што ён піша ў зборніку «Камета Галея»: «Я ведаю там кожны кут // і схаваны завулак. // І пустую лавачку, // дзе было выдрапана сэрца. // Я магу там блукаць, напэўна, усляпую» [5, с. 21–22].

Такім чынам, аналіз выбраных паэтычных і празаічных твораў дазваляе сцвярджаць, што вобраз Прагі яскрава паказаны ў літаратуры XIX–XX стст. у прадстаўнікоў розных мастацкіх напрамкаў, – ад рэалізму да постмадэрнізму. Чэшскія пісьменнікі, у адрозненне ад нямецкамоўных, ставяцца да Прагі не як да гатычнага вобраза, а, паводле Б. Грабала, як да горада, дзе перакрыжоўваюцца нацыянальныя кампаненты. Менавіта гэтая асаблівасць чэшскай сталіцы садзейнічае наватарству ў культурнай сферы і прыцягвае ўвагу новых паэтаў і празаікаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Набилкина Л. И.* Образ города в мировой литературе // Теория и практика общественного развития. 2014. №3. С. 219–221.

2. *Hrabal B.* Kličky na kapesníku. Praha : Práce, 1990.

4. *Айзпурвит К. У.* Творчество Ярослава Сейферта 20-х годов (к проблеме формирования индивидуального стиля): диссертация на соискание ученой степени кандидата филологических наук: 10.06.00. Москва, 2000.

5. *Seifert J.* Halleyova kometa. Praha : Státní nakladatelství, 1986.